**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ

па запыце выбарчага суб'екта
на змяненне парадку кандыдатаў спіса

27 траўня 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III-га склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разгледзеўшы на пасяджэнні 26 траўня 2024 года запыт выбарчага суб'екта "Блок Пракоп'ева-Ягорава" на змяненне парадку кандыдатаў спіса,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

24 траўня 2024 года ў 08:23 (CET) у Выбарчую камісію паступіў запыт ад прадстаўніка выбарчага суб'екта "Блок Пракоп'ева-Ягорава" Паўла Патапава на змяненне парадку кандыдатаў спісу. Да запыту прыкладзены прапанаваны парадак спіса кандыдатаў, які адрозніваецца ад зацверджанага Пастановай ад 25 красавіка 2024 года, і выкладзены довады, якія, па меркаванні заяўніка, сведчаць аб магчымасці змянення паслядоўнасці чальцоў спіса выбарчага суб'екта.

Згодна з прыведзеным абгрунтаваннем змяненне парадку кандыдатаў спісу з'яўляецца прэрэгатывай выбарчага суб'екта, не закранае інтарэсаў выбаршчыкаў і не можа аказаць уплыў на галасаванне.

Запыт утрымлівае спасылкі на пп. 3.2 пункта 3 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года (далей - Палажэнне), згодна з якім адсутнічае патрабаванне да выбарчага суб'екта размяшчаць кандыдатаў у парадку іерархіі. На карысць таго, што вызначэнне паслядоўнасці кандыдатаў спіса з'яўляецца прэрэгатывай выбарчага суб'екта, у прыватнасці, сведчыць пп. 6.1.3 пункта 6 Палажэння, з якога вынікае, што дадзенае пытанне знаходзіцца ў выключнай кампетэнцыі выбарчага суб'екта на этапе яго рэгістрацыі. Акрамя таго, заяўнік адзначае, што ва ўмовах адсутнасці патрабавання Палажэння да захавання спіса кандыдатаў выбарчага суб'екта ў нязменным выглядзе падчас усёй электаральнай кампаніі, дадзеная акалічнасць мусіць рэгулявацца дыспазітыўна: Выбарчай камісіі належыць здаволіць запыт выбарчага суб'екта, паколькі адсутнічаюць абавязковыя нормы, якія забараняюць учыняць змены ў спісе кандыдатаў.

Прааналізаваўшы довады і аргументацыю, выкладзеныя ў запыце, Выбарчая камісія прыходзіць да наступных высноваў.

Заяўнікам слушна адзначана, што пп. 3.2 пункта 3 Палажэння прама не прадугледжана патрабаванне да выбарчага суб'екта мець у нязменным выглядзе парадак спіса кандыдатаў падчас усёй электаральнай кампаніі. Абавязак прадугледзіць паслядоўнасць чальцоў спіса выбарчага суб'екта прама вызначаны толькі ў пункце 6 Палажэння, які датычыцца пытанняў рэгістрацыі выбарчага суб'екта.

Тым не менш, аналіз нормаў Палажэння прыводзіць да высновы аб тым, што паслядоўнасць кандыдатаў спіса, вызначаная на этапе рэгістрацыі выбарчага суб'екта, павінна захоўвацца ў нязменным выглядзе падчас усіх наступных этапаў выбарчага працэсу. Пра гэта сведчаць дзве акалічнасці:

Па-першае, у адпаведнасці з пп. 6.1.3 пункта 6 Палажэння спіс кандыдатаў павінен быць **расстаўлены ў парадку прыярытэту <u>атрымання мандата</u>**. То бок прадугледжваецца не проста пералік кандыдатаў, а менавіта строга вызначаная паслядоўнасць, на падставе якой у далейшым будуць размяркоўвацца пасады дэлегатаў у Каардынацыйнай радзе згодна з алгарытмам, прадугледжаным Дадаткам 2 да Палажэння (Метад Хэра-Німейера).

Па-другое, у адпаведнасці з прэамбулай да Палажэння рэгуляванне выбарчага працэсу павінна ажыццяўляцца адпаведна стандартам адкрытых, галосных, празрыстых і дэмакратычных выбараў. Дадзеныя стандарты прадугледжваюць **свабоду выбаршчыкаў фармаваць сваё меркаванне**, згодна з пп. 3.1 пункта 3 Асноўных прынцыпаў датычна выбараў, прынятых Венецыянскай камісіяй на 51-й пленарнай сесіі (Венецыя, 5-6 ліпеня 2002 года). Грамадзяне маюць права на атрыманне дакладнай інфармацыі пра кандыдатаў, выбарчыя спісы і іх палітычныя праграмы. На Выбарчую камісію ўскладзены пазітыўныя абавязкі даваць выбаршчыкам магчымасць азнаёміцца са спісамі кандыдатаў і асобнымі кандыдатамі, якія ўдзельнічаюць у выбарах, у тым ліку, шляхам належнага размяшчэння сродкаў нагляднай агітацыі (Асноўныя прынцыпы датычна выбараў – пункт 3, пп. 3.1, b, ii ).

Дадзеныя нормы, па меркаванні Выбарчай камісіі, накладаюць абмежаванні на выбарчы суб'ект па ўнясенні змяненняў у спіс кандыдатаў. Напрыклад, змены у афіцыйнай палітычнай праграме выбарчага суб'екта за некалькі дзён да выбараў, могуць увесці ў зман выбаршчыкаў датычна палітычных перавагаў.

Аналагічна, увесці ў зман грамадзян можа і змяненне паслядоўнасці кандыдатаў спіса, а менавіта: 1) выбаршчыкам вядомы правілы, паводле якіх адбываецца размеркаванне мандатаў; 2) згодна з гэтымі правіламі найбольшы шанец быць абранымі маюць тыя кандыдаты, якія знаходзяцца на верхніх пазіцыях спісу адпаведна іерархічнай паслядоўнасці; 3) робячы

выбар паміж адным ці іншым спісам кандыдатаў, выбаршчык прымае ва ўвагу верагоднасць абрання тых асобаў, якім ён аддае перавагу; 4) у выніку перамяшчэння фаварыта выбаршчыка без ведама апошняга на менш верагодную для абрання пазіцыю, грамадзянін можа быць ўведзены ў зман, паколькі пры галасаванні ён разлічваў на пэўна вызначанае месца кандыдата ў спісе; 5) фармаванне меркавання выбаршчыка адбываецца падчас усяго перыяду выбарчага працэсу, што, у сваю чаргу, не дазваляе патрабаваць ад грамадзян пастаянна высвятляць парадак кандыдатаў спісу і сачыць за яго змяненнямі.

Такім чынам, Выбарчая камісія лічыць, што парадак кандыдатаў у спісе мае ўплыў волевыяўленне выбаршчыка. З гэтай прычыны, Выбарчая камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка аб тым, што змяненне парадку спіса кандыдатаў падчас перыяду агітацыі не закранае інтарэсаў выбаршчыкаў і не можа аказаць уплыў на галасаванне.

З улікам выкладзенага, кіруючыся пп. 4.9 пункта 4 Палажэння, пунктамі 8, 9 і 12 Рэгламента працы Выбарчай Камісіі па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду (2024-2026), Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

У здавальненні запыта прадстаўніка выбарчага суб’екта “Блок Пракоп’ева-Ягорава” Паўла Патапава на змяненне парадку спіса кандыдатаў – адмовіць.

Рашэнне Выбарчай камісіі можа быць абскарджана цягам 48 гадзін з моманту яго атрымання або публікацыі.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька